# Я МАЮ ГОНАР ЖЫЦЬ У БЕЛАРУСІ

**Кудрашова Д. І.**
Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва, 8 клас
(г. Магілёў, Беларусь)
Кіраўнік праекта – настаўнік гісторыі Сулімава А. У.

Я вельмі люблю свой горад, сваю краіну, сваю Беларусь. Я ганаруся тым, што нарадзілася тут, у месцы, напоўненым энергіяй і святлом! Можа быць, і няма ў нашай краіне афрыканскай экзатычнасці, усходняй каларытнасці, чароўнасці сяродземнамор’я. Пяшчотная прыгажосць Беларусі можа раскрыцца перад чалавекам, здольным уважліва ўглядзецца ў глыбіню і сінь яе азёр, адчуць прахалоду рачулкі ў летні спякотны дзень, адчуць водар падснежнікаў вясной і пачуць курлыканне жураўлёў у восеньскім небе. Усе гэта вельмі дарага майму сэрцу.

Я люблю сваю краіну за прыгожую прыроду, за шматвекавую гісторыю. Але самы галоўны набытак Беларусі – гэта народ, яе людзі. Працавітыя, дружалюбныя, таленавітыя. Мы ні з кім не сварымся, не ваюем, зберагаем свае традыцыі і культуру, з павагай адносімся да другіх народаў. Шмат разоў нам даводзілася абараняць сваю зямлю, але, схіліўшыся, мы заўсёды паднімаліся зноў і зноў. і часцінка душы народа жыве ў кожным з нас, у нашай памяці.

Любоў да сваёй краіны для мяне пачынаецца з навукі берагчы памяць сваёй сям’і, свайго горада, свайго народа.

У кожнага горада, як і ў чалавека, свой лёс. У 2019 годзе майму роднаму гораду споўнілася семсот пяцьдзясят два гады! А мне толькі чатырнаццаць. Але я адчуваю, што нашы жыццёвыя дарогі цесна пераплецены, узаемазвязаны. Багатая і змястоўная, цікавая і няпростая, а месцамі трагічная гісторыя Магілёва знаходзіць жывы водгук у гісторыі маёй сям’і і ў маёй душы.

Недалёка ад Магілёва, у вёсцы Буйнічы, у нашай сям’і ёсць дом, які калісьці належыў маім прадзядулі і прабабулі Старавойтавым Пятру Іванавічу і Кацярыне Ільінічне. Там вельмі прыгожа. З высокага абрыву відаць Днепр, на берагах якога ў час Вялікай Айчыннай вайны ішлі баі за Магілёў. Наш дом два разы руйнавалі нямецкія танкі – у 1941 і ў 1944 гадах. Але прадзед і прабабуля двойчы яго адбудоўвалі. Аб чым яны думалі тады? Ці маглі яны прадбачыць, што праз многа гадоў іх праўнучка будзе любавацца прыродай на тым самым месцы, дзе калісьці грукаталі гарматы і свісталі кулі?! А можа быць, якраз марылі пра будучыню сваіх дзяцей, унукаў і праўнукаў, і таму з любоўю і надзеяй адбудоўвалі наша радавое гняздо? Вось таму я буду берагчы і гэты стары дом, і гэтую памяць аб продках. Вось таму кожны год буду чакаць прылёту буслоў у буслянку на суседняй бярозцы. і абавязкова перадам гэту спадчыну сваім дзецям і ўнукам, сваім нашчадкам, бо толькі той народ мае будучыню, які захоўвае сваю гістарычную памяць.

Я маю гонар жыць у Беларусі
і дыхаць водарам яе крыніц жывых.
і назіраць, як над буслянкай кружыць бусел,
Які вярнуўся з берагоў чужых.

Ён шмат гадоў кружыў таксама
Над вогнішчам, разбураным жытлом,
Не разумеў той птах, чаму палала
Яго буслянка полымем-агнём.

Чаму над Магілёвам чутны стрэлы,
Ад выбухаў стамілася зямля…
Мая краіна ў агні гарэла,
ішла Вялікая Айчынная вайна.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мы не скараліся нікому і ніколі,
Мой прадзед у вайне той перамог.
Адбудаваў у родным Магілёве
Ён новы дом – пачатак усіх дарог.

На даху зноў буслянка, клёка-бусел,
І словы прадзеда я гучна паўтару:
– Я маю гонар жыць у Беларусі,
І родны край, клянуся, зберагу!

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова